*Сосна Уладзімір Аркадзевіч*
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў*

## Змены ў стане беларускай дзяржаўнай вёскі у сувязі з падзеламі Рэчы Паспалітай

Дзяржаўная вёска ў Беларусі існавала яшчэ з часоў Вялікага Княства Літоўскага і ўяўляла сабой землі з сялянамі, якія належалі вялікаму князю як носьбіту дзяржаўнай улады. У 1590 г. вялікакняскі дамен быў падзелены на староствы і эканоміі. Эканоміі прызначаліся для задавальнения патрэб двара і знаходзіліся пад непасрэдным кіраваннем каралеўскай адміністрацыі. Староствы, якія заставаліся ў казённым ведамстве, аддаваліся ва ўтрыманне шляхціцам, радзей здаваліся ў арэнду. Уласнасць тых і іншых маёнткаў пры гэтым захоўвалася за дзяржавай.

Урад Рэчы Паспалітай падчас войнаў сярэдзіны XVII ст. пазычаў грошы ў многіх магнатаў. Не маючы магчымасці іх выплаціць,магнатам перадаваліся землі з дзяржаўнага фонду. Да сярэдзіны XVIII ст. феадальная знаць трымала значную частку старостваў. У Адама і Міхала Чартарыйскіх знаходзіліся Гомельскае, Усвяцкае і Падусвяцкае староствы, у графа Салагуба Езярыцкае староства і Віцебская эканомія. Сапега атрымаў Полацкую эканомію. Такім чынам, дзяржаўныя землі садзейнічалі росту эканамічнай магутнасці магнатаў і іх палітычнага ўплыву ў Рэчы Паспалітай.

У другой палове XVIII ст. сістэма вядзення гаспадаркі, эксплуатацыя і становішча сялян у староствах былі іншы раз горшыя, чым

у прыватных маёнтках, але ў цэлым займалі прамежкавае становішча паміж прыватнаўласніцкімі сялянамі і сялянамі эканомій. У адрозненне ад прыватных вотчын, дзе панавала самавольства ўладальнікаў, у дзяржаўных маёнтках на аснове перыядычна праводзімых па рашэнню ўрада люстрацый (апісанняў) складаліся інвентары, кантроль за выкананнем якіх ускладаўся на адпаведны дзяржаўны апарат. Рэформа дзяржаўных маёнткаў падскарбія А. Тызенгаўза 1765 г. прывяла да аднаўлення фальваркаў і да рэзкага павелічэння сялянскіх павіннасцей на карысць каралеўскага скарбу.

У ВКЛ, на думку Дз. Пахілевіча, “на агульным фоне сялянскага бяспраўя становішча дзяржаўных сялян усё ж было лягчэйшае, чым прыватнаўласніцкіх” [1]. Фармальна яны мелі права скардзіцца на злоўжыванні з боку часовых уладальнікаў і адміністрацыі ў вышэйшы дзяржаўны (каралеўскі) рэферэндарскі суд. Аднак на практыцы дабіцца чаго-небудзь сялянам было цяжка, паколькі ў рэферэндарскіх судах засядалі шляхціцы. Слабасць каралеўскай улады, абумоўленая "залатой шляхецкай вольнасцю" і ўзмацненнем палітычнай ролі магнатаў, якая расла разам з іх землеўладаннямі, не давала магчымасці дзяржаўным органам эфектыўна абараняць інтарэсы казны і ахоўваць ад спусташэння аддадзеныя ва ўладанне і трыманне староствы.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772,1793 і 1795 гг.) Беларусь была ўключана ў склад Расійскай імперыі. Кацярына II і Павел I падаравалі амаль усіх эканамічных сялян расійскім вяльможам. У складзе казённага саслоўя засталіся толькі прыгонныя староств і часткова маёнткаў, канфіскаваных ва ўладальнікаў, якія засталіся за мяжой ці выступілі супраць новай улады. Да пачатку XIX ст. колькасць дзяржаўных сялян скарацілася амаль да 1/20 часткі ўсяго насельніцтва Беларусі.

Агульнае кіраванне дзяржаўнай вёскай у Расійскай імперыі яшчэ з часоў Пятра I сканцэнтравалася ў Камер-калегіі, якая абавязана была, мець нагляд за ўсімі дзяржаўнымі даходамі. У складзе штатаў Пскоўскай і Магілёўскай губерняў 1772 г. быў вызначаны Дырэктар камерных спраў, праўленне якога падзялялася на пяць экспедыцый, з якіх "пятая – па кіраванню дзяржаўнымі, дварцовымі і эканамічнымі вёскамі" [2]. Але ў хуткім часе Кацярына II пераўтварыла мясцовы адміністрацыйны апарат. Згодна з "Устанаўленнем для кіравання губерняў" 1775 г., былі створаны казённыя палаты, у распараджэнне якіх трапіла ўся фінансава-гаспадарчая дзейнасць. Старшынёй казённай палаты з'яўляўся віцэ-губернатар, а ў склад яе ўваходзілі: дырэктар эканоміі, саветнік, губернскі скарбнік, два асэсары і чатыры прысяжныя засядацелі. Зыходзячы з мясцовых умоў, дапускаліся некаторыя адхіленні ў структуры апарату кіравання. Указам ад 30 кастрычніка 1794. г. дзяржаўныя сяляне ў заходняй частцы Беларусі былі перададзены ў распараджэнне Вярхоўнага праўлення, устаноўленага ў Гродна. "Казённае аддзяленне, – сцвярджалася ва ўказе, - утрымлівае ў ведамстве сваім усе каронныя і іншага звання маёнткі, прыналежныя да казны, з якіх збірае падаткі і іншыя даходы па ранейшаму Рэспублікі Польскай палажэнню" [3].

Казённая палата была адчынена тут у 1797 г. і падзялялася "на экспедыцыі: камерную, з ведамствам маёнткаў, якія ў казённым кіраванні знаходзяцца, рэвізскую, скарбовую, страявую і падліковую" [4]. Казённыя маёнткі даручаліся таксама нагляду віцэ-губернатара. Некалькі пазней, у 1802 г., Аляксандр I правёў адпаведную рэформу цэнтральнага ўпраўлення. Старая калегіяльная сістэма была заменена міністэрскай, з 1811 г. у складзе Міністэрства фінансаў з'явіўся Дэпартамент дзяржаўных маёмасцей, які сканцэнтраваў у сябе ўсе справы па казённых маёнтках, аж да скаргаў сялян на арандатараў.

Царскі ўрад захаваў за шляхціцамі, якія прынялі расійскае падданства, уступіўшыя раней у сілу правы на трыманне ці арэнду старасцінскіх маёнткаў. Гэтая акалічнасць абмяжоўвала магчымасці падараванняў казённых сялян новым памешчыкам. Таму пецярбургскія дзяржаўныя саноўнікі, нават пад маркай спачування сялянам, настойліва выстаўлялі планы неадкладнага адабрання ўсіх староставаў у казённае кіраванне. Аднак Кацярына II і тым больш яе пераемнікі, з палітычных меркаванняў, не пайшлі на такі крок. Разам з тым, першапачаткова быў прыняты шэраг мер па ўпарадкаванню існаваўшай арэнднай сістэмы. Насупраць даклада беларускага генерал-губернатара З. Чарнышова, дзе гаварылася аб уводзе пяцігадовага тэрміну арэнд і аддачы іх па імянных указах, Кацярына II зрабіла паметку: “Парабіць з арандатарамі кантракты, якія б ахоўвалі ад спусташэння тыя вёскі”[5]. Просьбы аб працягу арэнд павінны былі задавальняцца толькі ў выпадку “прыстойнага кіравання”.

У Расіі дзяржаўныя сяляне знаходзіліся на аброку і займалі прамежкавае становішча паміж памешчыцкімі прыгоннымі і свабоднымі людзьмі. Згодна з “Учреждением для управления губерний", для іх ствараўся асобны саслоўны суд – ніжнія і верхнія земскія расправы. Пры ўстанаўленні гэтых судоў дазваляліся элементы выбарнасці, у склад засядацеляў маглі ўвайсці і “беззаганныя” сяляне. Аднак Павел I закрыў расправы і наогул адмяніў пашырэнне расійскага заканадаўства на заходнія губерні. Ажыццяўленне гаспадарчых, адміністрацыйных і судовых правоў над сялянамі засталося ў руках арандатараў і адміністратараў казённых маёнткаў. Хоць урад і прыняў шэраг узаканенняў для абмежавання самавольства часовых уладальнікаў, але правы, якія даваліся велікарускім дзяржаўным сялянам, у беларускіх губернях ва ўмовах арэнднай сістэмы не маглі быць паспяхова рэалізаваны.

Кіруючыся інтарэсамі казны, царскі ўрад захоўваў ранейшы ўзровень эксплуатацыі дзяржаўных сялян, але імкнуўся засцерагчы дзяржаўныя маёнткі ад разарэння. У 1798 г. была праведзена люстрацыя старосцінскіх маёнткаў, якая замацавала тыя павіннасныя адносіны сялян да іх часовых уладальнікаў, што склаліся раней. Але праз 35 гадоў царская адміністрацыя сама прызнала, што "зробленая ў 1798 г. у Літве люстрацыя старосцінскіх маёнткаў прынесла казне мала карысці" [6]. Пэўнае значэнне мела стварэнне спачатку ў казённых, а пасля і ў астатніх вёсках заходніх губерняў запасных харчовых магазінаў. Спроба ж Паўла І заканадаўча абмежаваць ва ўсёй імперыі паншчыну 3-дзённай работай у тыдзень аказалася слабадзейснай. Аб гэтым сведчыць і ўказ 10 лютага 1809 г. аб захоўванні ў казённых арэндных маёнтках Віцебскай і Магілёўскай губерняў сялянскіх павіннасцяў "адпаведна ранейшым Польскім інвентарам" [7].

Значным цяжарам на сялян клаўся штогадовы дзяржаўны падатак. Аснову яго ў Рэчы Паспалітай складалі падымнае і гіберна (так званы грашовы пабор на зімовае утрыманне войска), а ў Расійскай імперыі – падушны падатак, памер якога ў канцы XVIII ст. вагаўся да рубля серабром. Пасля аказання ільгот ва ўплаце падушных грошай сельскае насельніцтва беларускіх губерняў было падведзена пад агульнаімперскі тып падатковага абкладання. Акрамя падушнага падатку, існавалі ў залежнасці ад мясцовых умоў земскія, "грамадскі" і "мірскі" зборы, натуральныя павіннасці (кватэрная, падводная, дарожная). У 1794–1796 гг. на ўсёй тэрыторыі Беларусі ўводзілася рэкруцкая павіннасць.

У свеце выкладзенага ясна, што Беларусь на мяжы XVIII–XIX стст. стала рэгіёнам Расійскай імперыі, дзе казённая вёска паводле арганізацыі гаспадарання і эксплуатацыі сялян па сутнасці мала адрознівалася ад памешчыцкай , калі амаль усе маёнткі апынуліся ў розных відах арэнды,

трымання і залогу. Спыненне ў 1801 г. падараванняў сялян у спадчыннае ўладанне прывяло да замены падараванняў усялякага роду доўгатэрміновымі і кароткатэрміновымі арэндамі. Гэтаму садзейнічала агульная накіраванасць палітыкі Аляксандра I у "польскім пытанні". Дэмагагічныя абяцанні аднавіць польскую дзяржаўнасць пад расійскім скіпетрам павінны былі пацвярджацца тут непарушнасцю форм землеўладання і эксплуатацыі сялянства.

Разам з тым, стан дзяржаўнай вёскі імперыі заставаўся няпэўным. Нягледзячы на спыненне падараванняў сялян у прыватнае спадчынае ўладанне, тэндэнцыя да раздачы, продажу нават калі не вёсак, то свабодных казённых земляў у меншай ці большай ступені працягвала існаваць ва ўнутранай палітыцы царызму. На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. дваране безупынна "закідвалі" прастол праектамі аб раздачы казённых земляў і сялян у прыватныя рукі.

**Літаратура.**

1. *Похилевич, Д.Л. Государственные крестьяне западных воеводств Великого княжества Литовского в XVI – XVIII вв. Автореф. дис.... докт. ист. наук. – Львов, 1950, с. 20.*
2. *Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. Ф. 16, спр. 763, арк.2.*
3. *1-е Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗ-1). Т. XXIII. № 17264.*
4. *Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1219, воп. 1, спр. 168, арк. 2.*
5. *Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). Ф. 379, воп. 3, спр. 886, арк. 6.*
6. *РДГА. Ф. 1589, воп. 1, спр. 943, арк. 47.*
7. *ПСЗ-1. Т. XXX. № 23475.*